# Хрысціянскія каштоўнасці ў казках для дзяцей і дарослых беларускай дзіцячай пісьменніцы Алёны Масла

Настаўнік беларускай мовы
і літаратуры Т.В. Гарох

Рака пачынаецца з вытокаў – людскія розум, мудрасць з словаў, што асвятляюць душу і накіроўваюць на добрыя справы

У нашым дзяцінстве самай радаснай хвілінкай была тая, калі мы заставаліся сам-насам з кніжкай. Разам з героямі-аднагодкамі мы марылі пра далёкія падарожжы, пра сустрэчы з цікавымі людзьмі, пра подзвігі у імя росквіту Радзімы. Прайшоў час, выраслі новыя пакаленні. Сучасныя дзеці маюць камп'ютэры, дзе ў сетцы Інтэрнэта размешчаны кнігі электронныя. Сучасныя кінафільмы часцей дэманструюць жорсткія законы свету, фізічную сілу і моц.

Пры сустрэчы з вучнямі на ўроку думаем кожны раз пра тое, каб прыгожымі выраслі нашы дзеці і знешне, і душой, з абавязковым пачуццём святасці і, якую ўмелі б берагчы, як свой самы каштоўны скарб, да якой адносіліся з глыбокай пашанай, любілі б усім сваім сэрцам. Якая ўзвышала б над паўсядзённай жыццёвай сумяціцай, давала сэнс і цану іх існаванню, асвятляла жыццёвы шлях, падтрымлівала і падбадзёрвала ва ўсіх жыццёвых выпрабаваннях.

Ёсць у жыцці бясспрэчная ісціна. Выхоўваць чалавека патрэбна на прыкладах, на узорах, якія праверaны часам, маюць сілу і моц, каб сапраўды запаліць у сэрцы сонца шчырасці, спачування, любві да людзей. Галоўная служба літаратуры як мастацтва і заключаецца ў тым, каб даць магчымасць кожнаму прайсці праз вернасць дабраце і чалавечнасці.

Звернемся да творчасці Алёны Масла – сучаснай бедарускай казачніцы, якая лічыць, што “Казка – гэта не толькі фантастычныя прыгоды і здарэнні. Гэта яшчэ і падарожжа кожнага з чытачоў ва ўласны свет пачуццяў, магчымасць глянуць на рэчаіснасць праз каштоўнае”. Пісьменніца звяртае ўвагу чытача ў казках на духоўныя каштоўнасці хрысціянства, якія вызначаюць адносіны асобы да самой сябе і свайго ўнутранага свету. Да такіх вышэйшых каштоўнасцей адносяцца каханне, свабода, ісціна, дабро, пачуццё абавязку, сумленне, якія характарызуюць ступень узыходжання чалавека да хрысціянскага ідэалу, годнасці і свабоды асобаснага выбару. Выступаючы важнейшымі праяўленнямі чалавечага існавання, гэтыя каштоўнасці з'яўляюцца паказчыкам ступені духоўнасці чалавека,

Мы адкрываем старонкі казкі Алёны Масла "Каляды з хроснай" і трапляем у чароўную краіну дабрыні і спагады. Заснавальнікамі каляднай казкі лічацца Ч. Дзікенс («Калядная песня ў прозе») і Г. Х. Андэрсен («Дзяўчынка з запалкамі»). У такіх творах абавязкова адбываецца цуд і перараджэнне героя. Маленькая дзяўчынка Віка разам з Хроснай святкуюць Новы год, адвозяць падарункі дзеткам, выконваючы даручэнне Дзеда Мароза. Віка вучыцца быць чараўніцай, робячы цуды і добрыя ўчынкі. Два тыдні з хроснай праляцелі вокамгненна, напоўненыя радасцямі, выпрабаваннямі, цудамі, прыгодамі, сюрпрызамі і неспадзяванкамі.

У цуд трэба верыць, безумоўна. Як верац у магію, у Боскія сілы і іншыя невытлумачальныя рэчы. Дзеці верац у цуд, ім не патрэбны доказы. Дарослыя — іншыя. Ім трэба заўсёды ведаць складаемыя кожнай рэчы, таму іх не цікавяць казкі. Але ёсць творы *для дзяцей*, здольныя закрануць зусім не дзіцячыя пачуцці нават у дарослых. Менавіта да такіх цудоўных твораў адносіцца казка Алёны Масла "Пакінутае дзіця". Адна з бібліятэкараў, прапаноўваючы чарговаму чытачу пазнаёміцца з творам, зазначыла: "Добра было б, калі б экзэмпляр казкі меўся ў кожным радзільным доме. Гэта стала б лепшай спробай адгаварыць маці пакідаць дзіця без бацькоў.

Чытача адразу ўражвае тое, што казка не пачынаецца традыцыйна: жылі-былі, або ў адным краі здарылася тая ці іншая прыгода. Пачынаецца яна з пралога-прыпавесці, дзе пісьменніца імкнецца растлумачыць чытачу ісціны, якія, на першы погляд, зусім простыя, але чамусьці зразумелыя далёка не ўсім. Словы-тлумачэнні гучаць як павучанні, запаветы, якіх павінен прытрымлівацца кожны чалавек. Напрыклад, вытрымка з казкі: "Дзіця – не пустазелле, каб расці сярод качаноў на градках. І не жабка, каб яго ў дзюбе насіў бусел.". Ці яшчэ: " Кожнае дзіця чакае сваё прызначэнне на Зямлі. Як вырастуць, адны з іх стануць музыкантамі, другія – пісьменнікамі ці паэтамі. І пакуль дзеткі ў Даліне Шчасця, анёлы апякуюцца над імі, павучаючы розным рамёствам і дабру. А пасля, у прызначаны час, перадаюць на выхаванне мама і татам. Так было спрадвеку" . У свяшэнным пісанні мы чытаем аб адносінах мужчыны і жанчыны як ісцінна чалавечых, аб пазнанні імі радасці і адказнасці бацькоўства і мацярынства.

Каб падкрэсліць прыгажосць духоўнага свету маленькага дзіцяці, якое павінна нарадзіцца, яго вялікую каштоўнасць, пісьменніца стварае вобраз ігры на жалейцы, як сімвал гармоніі прыгажосці цуду народжэння дзіцяці і зямнога хараства. Яна падкрэслівае, што "…валасы дзіцяці як …золата самага ласкавага сонца, а вочы – як найчысцейшыя крыніцы Даліны Шчасця."

На фоне незвычайна прыгожага апісання, стварэння рамантычна ўзнёслых вобразаў вельмі трагічна, непрывычна для жанру казкі выглядаюць падзеі, калі родная мама адказваецца ад народжанай дзяўчынкі, адбірае ад яе шчасце бацькоўскай апекі і любві. Дзяўчынка не знайшла на Зямлі Даліну Шчасця. Па законах казкі Анёл забірае дзяўчынку назад, на нябёсы. "Так паранілі сэрцайка дзіцяці, падкрэслівае казачніца, - што нават гаючае паветра Даліны не можа вылечыць яго"

Даросламу чалавеку, які мае багаты жыццёвы вопыт, павінны здавацца страшнымі і балючымі падзеі, апісаныя ў казцы "Пакінутае дзіця". Казачніца прапноўвае нам падумаць над прызначэннем чалавека на зямлі, над тым, што як піша Свяціцель Ціхан Задонскі, звяртаючыся да хрысціян "… умеў ты дзяцей сваіх нарадзіць, умей іх выхаваць у дабраце, толькі тады будзеш ісцінны іх бацька." Людзі, на жаль, парушаюць дадзены закон.

Алёна Масла ў казцы напамінае дзецям і дарослым пра абавязак чалавека на зямлі. "Ты ж некалі вырасцеш, станеш дарослым. І ў тваё жыццё пастукаецца адпраўленае на свет божы дзіця. Любі яго і помні, што шанаваць даверанае табе Богам жыццё – найпершы абавязак. Колькі людзей на Зямлі ўспомніць пра гэта, столькі анёлкаў на небе ўсміхнецца."

Казкі Алены Масла не толькі прывіваюць дзецям хрысціянскія каштоўнасці, а яшчэ і паспяхова выконваюць педагагічна-псіхалагічныя задачы. Магчыма, найбольш паказальнай у гэтым сэнсе з'яўляецца казка «Пакінутае дзіця», у якой прапануецца хрысціянская мадэль свету: дзеці жывуць у Даліне шчасця, як анёлы, і анёлы іх жа назад і забіраюць пасля смерці. Увогуле казка дае адказы на многія «дарослыя» пытанні дзяцей: «Адкуль я узяўся? Чаму тата і мама разышліся? Чаму некаторыя дзеці няшчасныя?» Невыпадкова Даліна шчасця ў казцы знаходзіцца на небе, з якім звязаны сюжэты многіх казак пісьменніцы.

Кожны дзіцячы твор выхоўвае ў маленькіх чытачах патрэбную мадэль паводзінаў: не размаўляй з незнаёмымі, як Чырвоны Капялюшык; не замахвайся на чужую маёмасць, як Ліса ў «Зайкавай хатцы» і г. д. Акрамя выканання падобных выхаваўчых задач казкі Алены Масла вучаць пэўнаму спосабу мыслення: назіраць за паводзінамі персанажа і даваць яму ацэнку *самастойна*. А гэта значыць, што маленькі чытач і аўтар стаяць нароўні, і дарослы ў такім выпадку ўжо не маралізатар, а суразмоўца, сябар.

Часам казкі А.Масла маюць сумны фінал, што для сённяшніх дзяцей, звыклых да шчаслівых фіналаў, нечаканасць.

Так, у казцы «Воблачка» маленькае воблака збягае ад маці, а калі вяртаецца, даведваецца, што пакуль не было яго, маці ад перажыванняў сышла на дождж. У казцы «Зорачка» распавядаецца пра хворую дзяўчынку,

якая можа памерці «раней адмеранага», а вось Зорачцы якраз падаравана самае доўгае жыццё. Але тая вырашае ахвяраваць ім і скаціцца з неба, каб падараваць сваё жыццё дзяўчынцы. Такое трагічна-драматычнае гучанне фінала казкі вельмі нагадвае знакамітыя казкі Г. Х. Андэрсена, якія часта таксама заканчваліся досыць сумна. Сама казачніца сцвярджае, што нельга адгароджаць дзяцей ад «цяжкіх» эмоцый і імкнуцца толькі да забаўляльнасці. Якія толькі выпрабаванні не пасылае людзям лёс, з якімі чалавечымі бедамі толькі не даводзіцца нам сутыкацца… Ці маюць людзі маральнае права наракаць на бяздушша, абыякавасць, чэрствасць грамадства у дачыненні да асабістых праблемаў, бедаў, калі імкнуцца засцерагчыся ад супераджывання і дапамогі ў час свайго дабрабыту тым, каму дапамога патрэбная?..»

Алёна Масла ў адным з інтрав'ю сказала аб тым, што Г.Х. Андэрсэн – адзін з любімых яе пісьменнікаў-казачнікаў. У свой час датскі казачнік сцвярджаў «Я заўсёды меў на ўвазе, што пішу казкі не толькі для дзяцей, але і для дарослых. Дзяцей больш забаўляе сама фабула, а дарослых цікавіць укладзеная ў казкі ідэя». Алёна Масла, беларуская казачніца – наша сучасніца лічыць, што "казкі лечаць, дапамагаюць жыць у гэтым свеце. У казках існуе закон: дабро перамагае зло. Заўсёды. Хачу, каб так было і ў маёй душы. І калі нехта возьме ў рукі мае кнігі – спадзяюся, што хаця б дробінку гэтага свайго жадання здолею данесці да чытача".

Казкі А. Масла адкрываюць нам свет незвычайнай дабрыні і духоўнай прыгажосці. У іх узята лепшае з казачных традыцый класікаў, народнай традыцыі і хрысціянскай стратэгіі жыцця. Дарослы ў іх не шукае перш за ўсё мараль, а становіцца суразмоўцам дзіцяці.

У аснове гэтых твораў — абсалютная дабрыня і любоў да ўсяго, што акружае.

А любоў і дабрыня, як бы не мяняўся свет, заўсёды будуць асновай любой сістэмы выхавання дзіцяці — каб выхаваць Чалавека, які любоў і дабрыню ўмее аддаваць.